**ВОДЗЫЎ**

**на аўтарэферат дысертацыі Алены Аляксандраўны Карп "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія**

Мастацкая спадчына першай трэці XX стагоддзя, надзвычай багатая і разнастайная ў праблемна-тэматычных, ідэйна-эстэтычных і жанравых адносінах, нязменна прыцягвала ўвагу літаратуразнаўцаў. Творы пісьменнікаў-нашаніўцаў, удзельнікаў літпрацэсу 1920-х і 1930-х гадоў і зараз застаюцца перспектыўным і ўдзячным аб'ектам шматлікіх даследаванняў. Разам з тым пытанням беларускай крытыкі, зараджэнне і станаўленне якой адбывалася ў гэты перыяд, прысвечаны лічаныя працы. Аднак, як слушна падкрэслена ў аўтарэфераце, крытыкай "менавіта тады (у першую трэць XX стагоддзя. – *Н. З.*) былі закладзены цвёрдыя эстэтычныя прынцыпы асэнсавання мастацкіх твораў, дзякуючы чаму стала магчымым якаснае, інтэнсіўнае развіццё беларускай літаратуры" (с. 1). Таму без уважлівага вывучэння крытычнага наробку ў знакавыя 1910–1930-я гады ўяўленне пра гісторыю нацыянальнай літаратуры будзе няпоўным, а карэктная ацэнка тагачаснага літаратурнага працэсу немагчымай.

Дысертацыя А. А. Карп з'яўляецца чаканай і запатрабаванай: фундаментальная праца М. І. Мушынскага "Беларуская крытыка і літаратуразнаўства (20–30-я гады)" выйшла ў 1975 годзе. Даўно наспела неабходнасць актуалізаваць веды пра феномен нацыянальнай крытыкі, удакладніць іх з улікам сучаснага сацыяльна-культурнага вопыту, дапоўніць фактычным матэрыялам, які раней не мог быць уключаны ў навуковы дыскурс, што і зрабіла А. А. Карп. Імпануе абраны дысертанткай падыход, згодна з якім крытыка першай трэці XX стагоддзя разглядаецца як адзіны непарыўны працэс, што складаецца з трох асобных, аднак звязаных і ўзаемаабумоўленых перыядаў. Даследаваннем вынікаў крытычнай практыкі не толькі ў сінхранічным аспекце (у межах кожнага з перыядаў), але ў дыяхраніі побач са значным аб'ёмам прааналізаваных тэкстаў і рэпрэзентатыўнасцю персаналій забяспечваецца абгрунтаванасць і верагоднасць высноў.

У аўтарэфераце адлюстравана прадуманасць і лагічнасць размяшчэння ўсіх структурных частак дысертацыі. Заслугоўвае станоўчай ацэнкі адпрацаванасць стылю, вывернасць і важкасць кожнага тэзіса, адсутнасць прахадных фраз. Шэраг лаканічна выказаных у аўтарэфераце назіранняў (пра стратэгію маналагічнай згоды А. Луцкевіча – с. 8, "творча-канструкцыйны

шлях" развіцця нашай літаратуры, прапанаваны ўзвышаўскай крытыкай, – с. 11, паняцце "канкрэтная крытыка" ў дачыненні да Я. Коласа – с. 13, інш.) выклікаюць вялікую цікавасць і жаданне азнаёміцца з поўным тэкстам працы.

Звяртаюць на сябе ўвагу і бачацца навукова каштоўнымі наступныя падыходы аўтара і вынікі дысертацыі:

- даследаванне беларускай крытыкі ў эстэтычным дыскурсе, што дазволіла правесці шматаспектны аналіз крытычных матэрыялаў, разгледзець не толькі іх эстэтычную інтэнцыю, але і камунікатыўную прыроду;
- пашырэнне і канкрэтызацыя навуковых уяўленняў пра набыткі вядучых крытыкаў А. Бабарэкі, Я. Пушчы, У. Чаржынскага, І. Замоціна, М. Піятуховіча і інш.;
- увядзенне ў навуковы ужытак новых звестак (уплыў ідэй А. Бялецкага на творчасць А. Бабарэкі, Ю. Бярозкі), зварот да тэкстаў малавядомых або па розных прычынах не дастакова даследаваных аўтараў (А. Луцкевіч, К. Гарабурда).

Неабходна таксама адзначыць выяўлены ў аўтарэфераце высокі адукацыйна-метадычны патэнцыял і практычную значнасць дысертацыі. Яе вынікі могуць прымяняцца пры далейшым вывучэнні гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры, пры напісанні падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і праграм для ВНУ па "Літаратурнай крытыцы", падчас правядзення лекцыйных і практычных заняткаў.

Мяркуючы па аўтарэфераце, можна сцвярджаць, што дысертацыя "Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс" уяўляе сабою цэласнае кваліфікацыйнае даследаванне, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
беларускай і замежнай літаратуры
УА "Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" Н. В. Заяц

Водгук паступіў у савет
03. 03. 2023г.
вуч. сакратар. [подпіс] (Богдан А.І.)

З водгукам азнаёмлена А. Карп
(Карп А.А.)
03. 03. 2023г.

Заяц Н.В.
Подпіс ... начальніка ОК БДПУ
С. Б. Лисенко
... 2023